# РАЗДЕЛ I. МЕЖДУНАРОДНЫЕ ОТНОШЕНИЯ. ГОСУДАРСТВО И ПРАВО. ПОЛИТОЛОГИЯ. ИСТОРИЯ

## Да пытання аб ліквідацыі нацыянальных адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак у БССР у 1934–1939 гг.

*Альховік М. К., асп. БДУ,*
*нав. кір. праф. Зялінскі П. І., д-р гіст. навук*

У БССР нацыянальныя адміністрацыйна-тэрытарыяльныя адзінкі (раёны і сельсаветы) былі адной з форм работы з нацыянальнымі меншасцямі. Яны ствараліся з мэтай «усебаковага абслугоўвання працоўных розных нацыянальных меншасцей на іх роднай мове — рускіх, палякаў, яўрэяў, украінцаў, немцаў, латышоў, літоўцаў», г. зн. стварэння больш спрыяльных магчымасцей для задавальнення іх нацыянальна-культурных і гаспадарчых запатрабаванняў, палітычных правоў. З іншага боку, нацыянальная аўтаномія дазваляла ўцягнуць шматэтнічнае насельніцтва «ў будаўніцтва сацыялізму, у стварэнне культуры, нацыянальнай па форме і сацыялістычнай па змесце» [1, с. 84].

Дзве пастановы ЦК УКП(б) аб ліквідацыі нацыянальных саветаў у СССР (пастанова ад 1 снежня 1937 г. «Аб ліквідацыі нацыянальных раёнаў і сельсаветаў» і пастанова ад 20 лютага 1939 г. «Аб ліквідацыі і пераўтварэнні штучна створаных нацыянальных раёнаў і сельсаветаў») хутчэй канстатавалі факт амаль што ажыццёўленай ліквідацыі нацыянальных адзінак у СССР і БССР, чым запачаткоўвалі гэты працэс. У БССР працэс рэарганізацыі і скасавання нацсаветаў — спачатку польскіх, а затым і астатніх — пачаўся яшчэ ў кастрычніку 1934 г. (24 ліпеня 1934 г. ЦК УКП(б) указаў КП(б)Б на «няправільную палітыку і практыку насаджэння ў раёнах і сёлах з большасцю беларускага насельніцтва польскіх школ і прымусовага навучання дзяцей на польскай мове»). Нацыянальныя раёны і сельсаветы не згадваліся ў Канстытуцыі СССР 1936 г. і Канстытуцыі БССР 1937 г. У жніўні-верасні 1937 г. перасталі дзейнічаць польскія сельсаветы. Да 1938 г. яўрэйскія нацыянальныя раёны, як быццам «штучна створаныя», былі расфармаваны ці пераўтвораны ў звычайныя тэрытарыяльныя адзінкі і страцілі статус нацыянальных. Апошні нацыянальны савет БССР быў ліквідаваны ўказам Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР 20 красавіка 1939 г.

З 1934–1935 гг. у грамадскай свядомасці ўкараняецца меркаванне аб тым, што існаванне нацыянальных адзінак перашкаджае «інтэрнацыянальнаму выхаванню мас», іх згуртаванню вакол Кампартыі: «А ў калгасе хто дзеліць на чыста “беларускія” брыгады, чыста “яўрэйскія” брыгады і г. д., хто спрабаваў у некаторых сельсаветах ажыццяўляць бундаўскую буржуазна-нацыяналістычную аўтаномію? Гэта ўсё рабілі, прыкрываючыся нацыяналістычным сцягам, нацдэмы, бундаўцы і г. д.» [2, с. 111]. З цягам часу ўтварэнне нацыянальных сельсаветаў пачало разглядацца як ажыццёўленае «ворагамі народа» ў шкодніцкіх мэтах (напрыклад, утварэнне польскага Дзяржынскага раёна — «цэнтра польскіх шпіёнаў» — разглядалася як цана супрацоўніцтва кіраўніцтва беларускай рэспублікі з Польшчай) [3, арк. 40–43].

Пры ліквідацыі нацыянальных саветаў амаль заўсёды адсутнічала матывацыя. Але часам называліся такія прычыны:

а) большасць насельніцтва размаўляла на беларускай мове;

б) насельніцтва чытала толькі беларускую і рускую друкаваную прадукцыю;

в) у сельсавеце справаводства, сходы і даклады ажыццяўляліся на беларускай мове;

г) у выніку раскулачвання і палітычных рэпрэсій значна зменшыўся лік польскага (альбо іншага) насельніцтва;

д) неабходнасць правядзення адміністрацыйна-тэрытарыяльных змяненняў;

е) недастатковае разгортванне палітычнай работы сярод насельніцтва;

ж) існаванне нацыянальнай адзінкі не апраўдвалася нацыянальным складам насельніцтва;

з) раён (сельсавет) быў створаны ў шкодніцкіх мэтах.

Апрача агульных прычын, якія былі абумоўлены зменай лініі Камуністычнай партыі і Савецкага ўрада ў адносінах да нацыянальных меншасцей, ліквідацыя нацыянальных раёнаў і сельсаветаў была звязана і з прынцыповай нерэалізаванасцю нацыянальна-тэрытарыяльнага прынцыпу ў будове дзяржавы на ўзроўні раёна і сельсавета — самых масавых формы самавызначэння народаў. Нацыянальны прынцып на ўзроўні сельсаветаў і раёнаў не быў рэалізаваны, па сутнасці не спрацоўваў, бо пераважная частка сельсаветаў і раёнаў нацыянальнымі не з’яўляліся. Значная частка насельніцтва не магла задаволіць сваіх этнакультурных запатрабаванняў, калі яна не мела большасці ў іншанацыянальных сельсаветах і раёнах. На тэрыторыі некаторых нацыянальных адзінак праводзілася палітыка беларусізацыі (напрыклад, на тэрыторыі польскага Фелікс-Конаўскага сельсавета Бялыніцкага раёна). З адваротнага боку, некаторыя нацыянальныя ўтварэнні (у т. л. Дзяржынскі польскі раён) былі штучна ўтвораны: на іх тэрыторыі нацыянальныя меншасці не складалі большасці насельніцтва.